Інфармацыйная культурна-грамадская газета Гарадоччыны

# ГАСЦІНЕЦ

Ня бойся!

№ 7 (82), КРАСАВІК 2009 ГОДА

http://haradok.belarda.org - сайт твайго ГАРАДКА

**Цытата нумара:**

Какое правительство самое лучшее?
Это такое правительство, которое учит нас обходиться без него.

***И. В. Гёте***

## Гарадоцкія вуліцы “паплылі”



Беларусь рыхтуецца запусціць спадарожнік, а ў райцэнтрах жыхары з цяжкасцю рухаюцца па вуліцах прыватнага сэктару.

Адносіны ўладаў да дабраўпарадкавання, як піяр-кампаніі добра бачна праз адносіны да вуліц прыватнага сэктару ў правінцыі. З 2003 году штогадова вядзеца дзейнасць па дабраўпарадкаванню гарадоў і мястэчак. Пэўныя зрухі ў гэтым для цэнтраў мястэчкаў дасягнуты – ля будынкаў райвыканкамаў і сельсаветаў перастала расці пустазелле, а зроблены кветкавыя клумбы і праведзены ландшафтны дызайн. І пры гэтым камунальнікі ў вялікай колькасці даглядаюць перш за ўсё тэрыторыю ля райвыканкама, асабліва не звяртаючы увагу на тэрыторыі ля шматпавярховых дамоў. І зусім на ролі сірат застаюцца вуліцы для прыватнага сэктару, дзе да элементарнага падсыпання пяску гадамі не даходзяць рукі камунальнікаў.

2009 год ўлады з помпай абвясцілі Годам роднай зямлі, распрацаваўшы вялікі япланы мерапрыемстваў па дабраўпарадкаванню. На жаль, у гэтых мерапрыемствах няма планаў па ўмацаванню пакрыцця дарог прыватнага сэктару. Да трэці вуліц райцэнтраў застаюцца без асфальтавага пакрыцця і ператвараюцца ў дрыгву па вясне і восені. На гэтыя вуліцы не даязджае дзяржкантроль і не ступае нага абласнога вертыкальшчыка. Па гэтай дрыгве беларусы прабіраюцца на працу, вядуць сваіх дзетак у школы і садкі і «добрым» словам успамінаюць улады, якія пускаюць «пыл» увочы вышэйшаму кіраўніцтву ландшафтным дызайнам ля будынкаў райвыканкама. Гаворка аб тым, што спачатку навядзем парадак у цэнтры, а потым пяройдзем да акраін ужо чуецца здзекам, для грамадзян, якія нармальна не могуць прайсці па вуліцы да сваіх дамоў. У Гарадку такіх вуліц набярэцца з дзесятак, на якіх трэба апасацца вадапада ад машын або асцярагацца за боты, якія могуць застацца ў гразі. Жыхары вуліц Міра і Стараполацкай, Валіева і Маладзёжнай, Сонечнай і Казлова і іншых ніяк не дачакаюцца вырашэння сваіх шматгадовых праблем. Калі б улады маглі чуць сваіх жыхароў з вуліц правінцыйных гарадоў, то даведаліся, што жыхарам патрэбны не «Сілічы» з лядовымі палацамі, а элементарная падсыпка вуліц. Жыхары параіліб аблвыканкаму і Саўміну не даваць дабро на набыццё джыпаў і пазадарожнікаў для чыноўнікаў, а пусціць гэтыя мільёны і мільярды рублёў на давядзенне да ладу акраінных вуліц райцэтраў, якія патанаюць у дрыгве па вясне і восені. Што не дарабілі камуністы, зараз ніяк не жадаюць дарабляць мясцовыя вертыкальшчыкі.

**Л. Антонаў.**

## ГАРАЖАНКА ЗАТАПІЛА ДЗЕСЯТКІ ДАМОЎ І ПАБУДОЎ



З 13 на 14 красавіка прыватны**я дамы і пабудовы ля рэчкі Гаражанка ў Гарадку апынуліся ў вадзе. Жыхары вымушаны былі эвакуіравацца самі або з дапамогай супрацоўнікаў Гарадоцкага аддзела МНС. З 15 красавіка рака пачала адступаць - узровень вады за суткі зменшыўся на 30 см.**

Першы моцны веснавы дождж, які ішоў нядзелю і панядзелак выклікаў пад’ём вады у Гаражанцы больш чым на метр. За суткі выпала амаль паўмесячная норма ападкаў – 24 міліметра. Рака яшчэ не паспела вынесці ўсе воды ад таяння снягоў і не справілася з чарговым вадападам. Ад завулка Вакзальнага праз вуліцу Зарэчанскую і да завулкаў вуліцы Галіцкага ў вадзе апынуліся дзесяткі дамоў і гаспадарчых пабудоў.

Поўнасцю пад вадой апынуўся пешаходны мост для настаўнікаў і вучняў СШ №2 Гарадка. Пад вадой аказаліся і палеткі ўздоўж ракі, а таксама ўсе блізкія ля вады хляўчукі.

Падобныя навадненні не часта адбываюцца на Гаражанцы. Апошні патоп быў гадоў 20 назад. Але такога моцнага навадnення старажылы не памятаюць наогул.

Жыхарам давядзецца шукаць магчымасць атрымаць дапамогу ва ўладаў у выніку гэтага стыхійнага бедства.

**Л. Антонаў.**

## НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ РОДНАГА САЙТА

На рэгіянальным сайце http://haradok.belarda.org , які змяшчае навіны усходняй Віцебшчыны, адбыліся змены. На сайце маецца “Карысная інфармацыя” ў якой у каталагу “Файлавы архіў” размешчаны PDF-версіі незалежных выданняў рэгіёна, у тым ліку і нашага выдання “Гасцінец”. І вы маеце магчымасць чытаць электронную версію выдання раней, чым яна трапіць у вашу скрыню.

Адначасова з гэтым на сайце з’явілася магчымасць размяшчаць прыватныя абвесткі ў раздзеле “Апошнія аб’явы”, а таксама карыстацца гэтымі аб’явамі.

Адміністратары сайта заклікаюць наведвальнікаў сайта выкарыстоўваць “Зваротную сувязь” і дасылаць свае навіны для размяшчэння на сайце. Найбольш актыўных наведвальнікаў сайта чакаюць прызы. Нагадваем таксама, што на сайце пастаянна вядзення апытанне наведвальнікаў.

**Вынікі апытання на http://haradok.belarda.org:**
**У Год роднай зямлі трэба па-першае:**

| | |
|---|---|
| Высадзіць шмат кветак | 4% |
| Шмат ландшафтнага дызайну | 4% |
| Засыпаць ямы на вуліцах | 28% |
| Асфальтаваць вуліцы | 40% |
| Паўсюдна прыбраць смецце | 24% |

## АБ’ЯВА

*Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Гасцінец» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – зрабіце бесплатную падпіску.*

*Рэдакцыя “Гасцінец” змяшчае бясплатныя абвесткі чытачоў выдання. Дзеля размяшчэння абвесткі запоўніце купон або патэлефануйце ў рэдакцыю.*

*Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас: Гарадок, вул. Галіцкага д.16 кв.2 ў кожны аўторак і чацвер з 16 да 18, або на тэлефоны газеты «Гасцінец».*

*Жадаючыя атрымаць у карыстанне беларускія кнігі, часопісы або іх набыць звяртайцеся на адрас: Гарадок, вул. Галіцкага д.16 кв.2 ў кожны аўторак і чацвер з 16 да 18, або на тэлефоны газеты «Гасцінец».*

## АБМЕРКАВАЦЬ ПЫТАННЕ МЭТАЗГОДНАСІ ПАБУДОВЫ АЭС

**Прапануюць актывісты «Руху за Свабоду» Леанід Аўтухоў і Леанід Гаравы для выбаршчыкаў Гарадка.**

Са сваёй чарговай заявай на масавае мерапрыемства яны звярнуліся ў Гарадоцкі райвыканкам дзеля атрымання дазволу на рэалізацыю канстытуцыйнага права на сход грамадзян. Сход плануецца правесці 23 красавіка з 17.30 да 19.00 ў зале Дома культуры г. Гарадка з удзелам лаўрэята прэміі Еўрапейскага Саюза імя акадэміка А.Д. Сахарава Аляксандрам Мілінкевічам.

Да гэтага часу шчэ вядзецца судовае абскарджанне адмовы гарадоцкага райвыканкама на сход выбаршчыкаў на 9 студзеня 2009 года. Віцебскі абласны суд не задаволіў скаргу па адмене рашэння Гарадоцкага суда, які не пагадзіўся з Леанідам Аўтуховым, што намесніца старшыні райвыканкама Надзея Бурунова парушыла канстытуцыйнае права грамадзян на сход. У абласны суд спадар Аўтухоў прадставіў і адказ пракуратуры раёна, дзе адзначана, што Гарадоцкі райвыканкам парушыў заканадаўства не надрукаваўшы рашэнне аб масавых мерапрыемствах у раёнцы, а таксама даведку, што ў дзяржаўным рэгістры нерухомай маёмасці няма зямельнага ўчастку «Урочышча «Вараб’ёвы Горы», куды старшыня райвыканкама накіроўвае масавыя мерапрыемствы.

Зараз рыхтуецца скарга ў Вярхоўным Суд аб парушэнні права грамадзян на сходы, якія ніяк не дазваляюць правесці ў Гарадку. Між тым ў будынку райвыканкама, ў Доме культуры ладзяцца сходы і ветэранскай арганізацыі, і мясцовых садаводчаскіх таварыстваў і ніхто іх не накіроўвае ў лес.

**В. Васільеў.**

## Для актывіста Аўтухова няма “вакансіі”

**Трэццяя арганізацыя Гарадка страціла вакансію, калі да кіраўніцтва звярнуўся актывіст Руху «За Свабоду», старшыня раённай арганізацыі Партыі БНФ Леанід Аўтухоў.**

**Са снежня 2008 году актывіст Леанід Аўт**ухоў спрабуе ўладкавацца на працу праз Цэнтр занятасці г. Гарадка. Маючы прафесію электрыка-механіка ён спрабуе ўладкавацца на тыя арганізацыі і прадпрыемствы, якім патрэбны электрыкі. Прадпрыемствы і арганізацыі райцэнтра час ад часу даюць інфармацыю Цэнтру аб наяўнасці вакансій электрыкаў і пры гэтым падцвярджаюць спецыыялістам Цэнтра іх наяўнасць раніцай, калі туды накіроўваюць Леаніда Аўтухова. Але пакуль за 10-15 мінут ён дабіраецца да арганізацыі, то там раптоўна знікае дадзеная вакансія. Так было ў снежні, калі знікла вакансія на Гарадоцкай птушкафабрыцы, так было ў лютым, калі знікла вакансія на прадпрыемстве па абязбройванню авіябаепрыпасаў. Аналагічная сітуацыя адбылася к красавіку ў галоўнага ўрача райбальніцы В. Самсонава, куды накіраванне атрымаў Аўтухоў. Спачатку дня вакансія існавала, а калі галоўны урач даведаўся, што Аўтухоў звольнены па палітычных матывах, то вакансія электрыка знікла.

Так гарадоцкія ўлады ідуць на «лібералізацыю», працягваючы пераслед дэмакратычнага актывіста за іншадумства.

**В. Васільеў.**

# Новый проект в Городке - внедорожник «Volkswagen Touareg”

Опережая прозвучавшие сегодня указания руководителя Беларуси Александра Лукашенко о том, что бюджетные средства должны выделяться на первоочередные проекты, руководство Городокского ГРУП ЖКХ «Городок» уже вчера или ранее приобрело по высокому согласованию свыше внедорожнике «Volkswagen Touareg».

Это очень правильное решение! Ведь по окраинным улицам Городка, только, наверное, на внедорожнике и можно проехать. Вот захочет директор организации Гуринов Евгений Васильевич проехать по Молодежной, Валиева, Солнечной, Старо-Полоцкой, чтобы проверить состояние дороги, а там ехать без внедорожника дискомфортно. Ямы на яміне, грязь по уши весной и осенью. А так сел за руль комфортного авто и чувствуешь себя человеком, а не букашкой, которая ползет по болоту. Какой же ты руководитель, когда не можешь обеспечить для себя комфортные условия труда???

И не надо завидовать Евгению Васильевичу! Нелёгкая это работа – быть руководителем коммунальной организации. Ведь кого в первую очередь за чубы берут жители? Коммунальщиков!

Сейчас почти 70% жилого фонда Городка, со слов специалистов организации, нуждается в капитальном ремонте. То крыши текут. То потолки обвисают. То стояки ломаются. То подъезды не убираются. То возле домов не проехать. И жалобы поступают всякие… А кто в ответе? Руководитель…

Да и не плохой это руководитель. Мало ли что он уволил по окончанию контракта демократического активиста Леонида Автухова. Ну и что, что Автухов не имел замечаний и нарушений внутреннего распорядка, а имеет на иждивении двух несовершеннолетних детей? Ведь такая государственная линия – давить инакомыслие в трудовых коллективах. И правильную позицию занял тут Евгений Васильевич. Оценили.



Это ведь, наверное, тоже учитывается при определении лучшего человека года? В общем, как тут не поддержать такой перспективный инвестпроект -- приобретении внедорожника. И Гуринов достойный человек. И трудно ему дальше по городокским дорогам без внедорожника ездить. И кто это сказал, что надо бы за эти деньги новые рабочие места создавать? Как же их создашь, когда не можешь комфортно объехать Городок и район?

Вот увидят жители внедорожник «Volkswagen Touareg» и сразу поймут – руководитель коммунальщиков – не хухры-мухры, а сила. И к нему со всякими пустяковыми проблемами идти не стоит. Он большой начальник. К чему тут скупердяйство про какие-то 100 или 150 миллионов рублей? Ведь, наверное, не последнюю модель туарегов прибрели для коммунальщиков!

О том, кому и в каком ракурсе принадлежат слова «Каждый рубль из бюджета будем рассматривать под микроскопом», а также разное о внедорожниках «Volkswagen Touareg» читайте в дальнейших материалах. Посмотрите и плачевное состояние городокских дорог. И вы поймете правильность вложения бюджетных средств. Читайте и понимайте!

**Леонид Горовой.**

# СТАРШЕЕ ПОКОЛЕНИЕ НЕ В ПОЧЕТЕ

**Валерий Щукин, www.nash-dom.info написал очередную статью о суде в Городке по делу Анатолия Полянского. Городокский суд отменил штраф, наложенный за отсутствие фликера.**

О профессиональной и юридической некомпетентности главного городокского гаишника милицейское руководство Витебщины осведомлено. Тем не менее, майор Гвоздев в занимаемой должности все еще пребывает.

В день смеха (1 апреля 2009 года) председатель суда Городокского района рассматривал жалобу рабочего Полянского на неправомерное наложение штрафа. Судья Лешкович вынес совсем уж не смешное для майора постановление: взыскание начальника ГАИ отменить, поскольку наложено оно с грубым нарушением процессуального закона.

Грубое нарушение руководителем процессуального закона возможно в двух случаях. Либо незнание закона, либо сознательное пренебрежение требованиями акта государства.

Хрен редьки не слаще. Но это — для противоправно оштрафованного гражданина. Для областного милицейского руководства различие принципиальное. Ведь за:

— незнание основного руководящего документа, после пяти лет пребывания в занимаемой должности, должно последовать возвращение на более низшую ступеньку служебной иерархии;

— злостное нарушение закона тянет на возбуждение уголовного дела.

Майор Гвоздев уверен в своей безнаказанности. Потому как, едва выйдя из зала суда, тут же вручил рабочему Полянскому повестку о явке к нему в ГАИ для повторного разбирательства составленного им же протокола.

Первое разбирательство разгневанный главный гаишник проводил среди ночи (с 14 на 15 февраля) в районной больнице, используя в качестве судейского стола подоконник приемного покоя. Судя по всему, пребывание в полубессознательном состоянии и суета персонала приемного покоя с тонометрами, шприцами и прочими медицинскими атрибутами вокруг лица, привлекаемого к административной ответственности, для Гвоздева, как вершителя правосудия, препятствием не являлись.

Гвоздев не знает даже такой элементарной процессуальной нормы, как сроки вручения постановления. Согласно статье 11.11 ПИКоАП, постановление о наложении взыскания в течение трех дней направляется заказным письмом лицу, в отношении которого оно вынесено. Начальник городокской ГАИ не сделал этого ни в трехдневный, ни в трехнедельный срок. Лишь на 23-й день, да и то не по собственной инициативе, постановление забрала жена Полянского.

Повторное разбирательство гаишный руководитель назначил уже на дневное время (10 утра 4 апреля 2009 года) в автоинспекции.

Но кто пояснит: каким образом майор Гвоздев будет выполнять требование статей 6.13 и 6.14 административного процессуального закона в части всесторонней, полной и объективной проверки собранных им же доказательств совершения рабочим Полянским административного правонарушения? Каким образом майор будет признавать допустимыми собранные им же доказательства?

Очередная профанация Гвоздевым правосудия в расчете на вседозволенность?

Анатолий Полянский с помощью адвоката обратился в областную ГАИ с просьбой принять рассмотрение данного дела к своему исполнению. Будем надеяться на здравый смысл витебского руководства.

У Гвоздева здравый смысл явно отсутствует. Майор утверждает, что оштрафованный им Полянский двигался по проезжей части. Но зачем данному гражданину подвергать свою жизнь опасности, если, как следует из представленных суду фотографий, на той улице чуть ли не четырехметровая обочина, за движение по которой даже без фликера Правила дорожного движения ответственности не предусматривают. Правда начальник ОГАИ в суде утверждал, что обочина дороги 14 февраля была занесена снегом. Мол, виноваты дорожники, которые дороги не чистят. Потому и должен быть фликер у Полянского. Оставим и эту неправду на совести майора.

А как оценить ответ майора на обращение Полянского отпустить его, поскольку при артериальном давлении 190/110 он не в состоянии участвовать в следственных действиях? Гвоздев с издевкой произнес: вылечат в РОВД.

Лечили в милицейском отделе стряпанием протоколов об административных правонарушениях, и до утра. Перед рассветом, после завершения протоколотерапии, избитого Полянского вышвырнули на мороз.

О профессиональной непригодности Гвоздева свидетельствует и заявление майора, что Полянский ему абсолютно не знаком.

Городок — не столица и даже не областной центр, где водителей тысячи. Что это за начальник ГАИ, который за пятилетку в маленьком райцентре, где каждый на виду, не знает водителя с 30-летним стажем?

Хочу заметить, что и моральные качества данного милицейского офицера оставляют желать лучшего. Гвоздев задержал Полянского в 23 часа (вообще-то, даже, раньше). Покинул РОВД по окончании своего дежурства в два ночи. К тому времени задержанный им гражданин был лишен свободы передвижения уже более трех часов. При допустимой продолжительности административного задержания — три часа (статья 8.4 ПИКоАП).

С точки зрения морали Гвоздев должен был принять меры к освобождению задержанного и доставки домой. Поскольку задержал майор этого гражданина практически возле дома последнего. Начальник ГАИ заявил в зале суда, что покинул РОВД, не поинтересовавшись судьбой доставленного им бесфликерного пешехода.

Весь срок административного задержания Полянского составил пять часов.

***

Издевательское отношение чиновников к пожилым людям (Полянскому 59 лет) — обычное, рядовое явление в Городокском районе. В этот же день (1 апреля) я стал невольным свидетелем неуважительного чиновничьего отношения к 68-летней одинокой пенсионерке. Она 27 марта пришла в райисполком с просьбой оказать содействие в ремонте дома. В доказательство своей неплатежеспособности продемонстрировала рваный валенок.

Домовладелица — не журналист и швырять валенок в районного чиновника, по аналогии знаменитого ботинка, брошенного в президента Буша, не собиралась. Тем не менее, зам.предрика вызвал милицию. Старушку арестовали (задержали), составили протокол, а 1 апреля она вместе с участковым прибыла в суд.

Судья в действиях пенсионерки хулиганского умысла в покушении на высокого исполкомовского руководителя не усмотрела. Неуважение же районного чиновничества к старшему поколению тружеников просматривается явно.

# ДРАКОНАЎСКАЕ ПАТРАБАВАННЕ ПРАКУРОРА ДА ПАКАРАННЯ СІРАТЫ

7 красавіка пракурор Гарадоцкай пракуратуры Наталля Лятас запатрабавала ў суда для маладога спецыяліста, дэмакратычнага актывіста Аляксандра Жыткевіч тры гады «хіміі» і пазбаўлення права працаваць фельдшарам стаматолагам на пяць гадоў.Прапанова Лятас грунтуецца на заведама хлуслівых паказання «пацярпелага» Куліка.

На працягу двух дзён у Гарадоцкім судзе разглядалася справа Аляксандра Жыткевіча, якога пракуратура абвінавачіла ў атрыманні незаконнага ўзнагароджання за стаматалагічныя паслугі. Сведкі Фёдар Рыбікаў (пенсіянер, былы парторг саўгаса), Алена Семанькова ( маладая маці) паказалі ў судзе, што лячылі зубы ў Аляксандра Жыткевіча бясплатна і лячэнне праводзілася якасна. Загадчыца стаматалагічнага аддзялення Гарадоцкай райбальніцы, стаматолаг з 35-гадовым стажам Ларыса Ягораўна Шмаканава ў судзе засведчыла, што пасля напісання скаргі «пацярпелшы» Аляксей Кулік звяртаўся ў стаматалагічнае аддзяленне райбальніцы. Пры абследванні яго зубоў разам са стаматолагам Анастасіяй Стральцовай яны устанавілі, што яго пломбы на месцы і толькі адкалоўся кавалак зубной эмалі, які магчыма рэстаўрываваць платна. Але Кулік больш да паслуг стаматалагічнага кабінета не звяртаўся. Таксама Шмаканава засведчыла, што разгляд скаргі Жыткевіча на санітарку, а таксама з'яўленне скаргі адбылося на камісіі па этыцы, якую праводзіла намеснік галоўнага ўрача Вольга Зяленіна. Вопытны спецыяліст ахарактэрызавала Жыткевіча, як здольнага фельдшара, але які час бывае пакрыўджаным, застаючыся пры гэтым спагадлівым чалавекам.

Адвакат Ірына Бернік заявіла хадайніцтва аб выкліку ў суд сведак Стральцовай А., а таксама Зяленінай В., а таксама правядзення агляда зубоў пацярпелага Куліка спецыялістам. Суддзя Уладзімір Гладкоў адхіліў дадзенае хадайніцтвы, якія дазвалялі бы даследаваць справу ўсебакова і ў поўным аб'еме.

Прадэманстраваны аўдыёзапіс размовы па мабільнаму тэлефону Куліка выклікаў шмат пытанняў, бо быў змантаваны з дапамогай іншага мабільнага тэлефона, меў нізкую якасць і незразумелы сэнс. Хадайніцтва адваката аб правядзенні фонаграфічнай і семантычнай экспертыз выклікалі адмоўную рэакцыю суддзі Гладкова. Суддзя пацікавіўся -- чаму гэта не было заяўлена ў пракуратуры? Паказанні Ірыны Бернік аб тым, што пракуратура не задавальняла хадайніцтва аб азнаямленні з аўдыёзапісам пад час следства і толькі з пастановы Гладкова, пасля пачатку судовага працэсу абвінавачаны і адвакат мелі магчымасць азнаёміцца з запісам, які выклікаў шмат пытанняў не выклікалі ў суддзі Гладкова рашэння правесці экспертызу запісу.

Пасля азнаямлення з матэрыяламі справы і агляду рэчавых доказаў, агучвання ў судзе паказанняў сведкі Маргарыты Грыгорьевай пракурор Наталля Лятас выступіла з абвінавачаннем. У ім не былі крытычна прааналізаваны паказанні Куліка Аляксея, якія былі супярэчлівымі па многіх пазіцыях, а таксама не прагучала аргументаў аб шкоднасці учынка Жыдкевіча для грамадства, таксама не былі агучаны сумы страт, якія панёс Аляксей кулік. Але пасля агалошвання матэрыялаў справы без іх крытычнага аналізу Наталля Лятас запатрабавала ад суда пакарання Жыткевічу ў тры гады «хіміі» і пазбаўлення права для сіраты працаваць фельдшарам на працягу пяці гадоў.

Адвакат Ірына Бернік у прамове глыбока і аргументавана паказала ўсю супярэчлівасць паказанняў Куліка і яго маці, выявіла адсутнасць у суда падстаў для вырашэння крымінальнай справы ў судовым працэсе. Адвакат дала ацэнку паказанням Куліка, як заведама хлуслівым, якія не даюць магчымасці лічыць яго пацярпелым. У прамове акцэнтавалася увага суду на замоўленасць скаргі з боку работнікаў амбулаторыі, якія хацелі добра выглядаць пры разглядзе канфлікту на савеце па этыцы. Таксама адвакат указала на супярэчлівасць паказанняў сведкаў, якія не могуць лічыцца доказам віны Жыдкевіча. І прасіла суд прызнаць Жыдкевіча невінаўным ў сувязі з недаказанасцю яго віны і адсутнасцю ўсебаковага, поўнага і аб'ектыўнага даследавання доказаў.

Суддзя Гладкоў абвясціў працяг працэсу 10 красавіка а 16.00 у Гарадоцкім судзе.

**Л. Гаравы.**

# Адкрыць Еўропу для беларусаў



Канферэнцыя «Еўрапейская карта для Беларусі» з'яўляецца апошнім разглядам беларускага пытання гэтым складам Еўрапарламента. Вынікі абмеркавання будуць улічаны пры прыняцці рэзалюцыі па Беларусі.

– Гэта адно з найлепшых паседжанняў у Еўрапарламенце па беларускаму пытанню, бо акрамя канструктыўных, аб'ектыўных ацэнак, якія мы пачулі, адчувалася вельмі добрая эмацыянальная атмасфера. Бальшыня прысутных, з самых розных краінаў заангажаваліся беларускай праблематыкай. Я думаю, што гэта значнае дасягненне, – паведаміў Аляксандр Мілінкевіч

Паводле лідэра Руху «За Свабоду», ў сваіх выступах прадстаўнікі беларускай дэлегацыі казалі, што калі ёсць пэўныя пазітыўныя змены ў Беларусі, то яны на дадзены момант павярхоўныя і недастатковыя. Самае галоўнае – зрабіць зараз так, каб быў спынены палітычна матываваны пераслед. Людзі, іх абарона, павінны быць на 1-м месцы. Выступоўцы казалі пра неабходнасць зменаў у крымінальнае заканадаўства, якое мае палітычныя артыкулы. Усе таксама выказваліся за неабходнасць удзелу Беларусі у праграме Усходняга партнёрства.

Аляксандр Мілінкевіч акцэнтаваў увагу ў сваім выступе на тым, што зараз вельмі важна патлумачыць беларускаму грамадству перавагі еўраінтэграцыі, бо менавіта беларускі народ будзе рабіць геапалітычны выбар, перад якім хутка апынецца наша краіна.

– Я казаў пра тое, што структуры Еўразвязу шчыльна працуюць з уладай, каб з дапамогай эканамічных стымулаў для Беларусі спрыяць працэсам дэмакратызацыі і лібералізацыі. Але яшчэ ёсць беларускі народ які застаецца па-за дыялогам. Еўразвяз працуе з уладай, мы сустракаемся з еўрапейцамі, а дзе 10 мільёнаў беларусаў? Даводзіцца канстатаваць, што вельмі значная частка беларусаў жыве з савецкім мысленнем. Нам зараз вельмі важна еўрапеізацыя нашых грамадзян. Мы мусім казаць пра еўрапейскія каштоўнасці, пра станоўчыя бакі еўраінтэграцыі, каб людзі змаглі свядома рабіць свой выбар. Я ўпэўнены, што нашай краіне прыйдзецца рабіць геапалітычны выбар у бліжэйшы час. Ён будзе залежыць не столькі ад улады ці апазіцыі, якія прыходзяць і сыходзяць, а у першую чаргу ад нашага народа, – адзначае Аляксандр Мілінкевіч.

Лідэр Руху «За Свабоду» актыўна выступаў за спрашчэнне для беларусаў працэсу атрымання шэнгенскіх візаў і іх большую даступнасць:

– Зараз вельмі важна інфармаванне людзей, іх адукацыя. Мы можам многа гаварыць пра тое, што Еўропа адкрылася для Беларусі, але калі ў нас візы для паездкі ў краіны Заходняй Еўропы значна даражэйшыя чым для грамадзян Расіі і Украіны. Паводле агучанай на канферэнцыі статыстыцы, 67% беларусаў ніколі не былі ў краінах ЕЗ – нават у Польшчы ці Літве – 51% ніколі не размаўляў з прадстаўніком Еўразвязу. Мы мусім зрабіць усё, каб візы былі таннейшымі і з часам бясплатнымі, каб сапраўды адкрыць Еўропу для беларусаў.

Лідэр Руху "За Свабоду", нягледзячы на ўсе складанасці, аптымістычна глядзіць ў еўрапейскую будучыню Беларусі.

На канферэнцыі выступілі таксама Хізэр МакДжыл (Amnesty International), Жана Літвіна (БАЖ), Янэз Ленарчыч (Кіраўнік БДІПЧ), Роджэр Кішка (хрысціянскія юрысты Alliance Defense), Анжэліка Борыс (СПБ) Анатоль Лябедзька (АГП). На дыскусіі ад афіцыйнай Беларусі прысутнічаў амбасадар ў Бельгіі Уладзімір Сянько, што сведчыць пра паступовае наладжванне цывілізаванага дыялогу.

# "УЗРОВЕНЬ ДАВЕРУ ПАМІЖ БЕЛАРУСЬСЮ І РАСЕЯЙ ВЕЛЬМІ НІЗКІ"

***13 гадоў таму была падпісана дамова аб стварэньні супольнасьці Беларусі і Расеі. А 2 красавіка абвешчана афіцыйным днём яднаньня двух народаў.***

Аднак у двухбаковых стасунках узьнікаюць усё новыя праблемы. Да прыкладу, Расея не дала Беларусі крэдыт у 100 мільярдаў рублёў для пашырэньня разьлікаў у расейскіх рублях. Спынена вяшчаньне пяцёх расейскіх тэлеканалаў на тэрыторыі Беларусі. Прадпрыемствы абедзьвюх краінаў працуюць у розных эканамічных умовах. Афіцыйны Менск ад верасьня мінулага году пакуль так і не прызнаў самаабвешчаных Абхазіі і Паўднёвай Асэтыі. Які ж «саюз» з Расеяй пабудаваны і як доўга ён можа праіснаваць? Алесь Дашчынскі гутарыць з дацэнтам Маскоўскага інстытуту міжнародных дачыненьняў Кірылам Коктышам.

Дашчынскі: «Такое адчуваньне, што гэты саюзны праект цягам свайго ўжо працяглага існаваньня мае адну і тую ж хранічную хваробу — дамоўленасьці застаюцца на паперы».

Коктыш: «Беларуска-расейскі саюз, вядома ж, існуе і адыгрывае сваю ролю. І зьяўляецца для Расеі нейкім сродкам, каб страхаваць сваю нафту і газ, якія транспартуюцца праз беларускую тэрыторыю на Захад. І тыя адлічэньні, якія Расея робіць на карысьць Беларусі, — гэта якраз каля 5% ад таго аб'ёму, які ідзе праз беларускую тэрыторыю. І калі казаць, што беларуска-расейскі саюз быў сродкам хеджыраваньня расейскага газанафтавага транзыту, дык тут ёсьць рацыя, і ён такім сродкам і зьяўляецца. Пытаньне ў тым, ці меласі быць нешта іншае і нешта большае? І тут якраз у нас няма падстаў сьцьвярджаць, што нешта большае існавала нават як плян, а не як дэкляарацыя. Дэкляравацца магло, але насамрэч гэта не магло існаваць у галовах ні ў аднаго, ні ў другога».

Дашчынскі: «Аднак жа пакуль расейскі бок ня йдзе на тое, каб будаваць новыя транзытныя сыстэмы для сваіх энэрганосьбітаў праз Беларусь. Згадаем, што афіцыйны Менск, да прыкладу, настойвае на будаўніцтве другой ніткі газаправоду «Ямал — Эўропа». Дый эканамічная інтэграцыя ніяк не атрымліваецца...»

Эканамічнай інтэграцыі зусім ня варта чакаць у бліжэйшы час.

Коктыш: «Узровень даверу вельмі нізкі, каб такія праекты маглі ажыцьцяўляцца. Бо сумесны праект заўжды патрабуе нейкага ўзроўню даверу, які павінен значна адрозьнівацца ад нуля. Калі такога даверу няма, то немагчыма інвэставаць грошы, бо кожны з партнэраў будзе чакаць, што другі нешта зробіць насуперак дамоўленасьцям і правілам. Таму ніякія інфраструктурныя праекты ажыцьцяўляцца ня будуць.

Тое, што не адбылася эканамічная інтэграцыя — гэта таксама маркер таго, які нізкі давер паміж Расеяй і Беларусьсю. Бо ў Беларусі прысутнічае толькі той расейскі бізнэс, які структурна ня мае ніякага іншага выйсьця. Гэта найперш буйныя нафтавыя кампаніі. Сёньня ў Беларусі свае эканамічныя праблемы даволі цяжкія, у Расеі свае эканамічныя праблемы таксама даволі цяжкія. І час праблем — ня той час, калі шукаецца выйсьце ў выглядзе эканамічнай экспансіі і ў эканамічным будаўніцтве. Яно ажыцьцяўляецца на прыбытках, а зараз ідуць адны страты. А страты — гэта зусім іншая псыхалёгія, калі кожны імкнецца зачыніцца ў сваёй хаце і перачакаць. Так што эканамічнай інтэграцыі зусім ня варта чакаць у бліжэйшы час».

Дашчынскі: «У гэтым годзе адбыліся ажно тры сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі зь Дзьмітрыем Мядзьведзевым. Аднак якія вынікі мы бачым? Расея крэдыт у 100 мільярдаў рублёў не дала, а Беларусь прыпыніла трансьляцыю пяці расейскіх каналаў на сваёй тэрыторыі...»

Коктыш: «Гэтыя сустрэчы мелі дэманстратыўную мэту. Варта было напалохаць Захад, што Беларусь вось-вось зваліцца ў абдымкі Расеі. І можна лічыць, што гэты вэктар быў адыграны больш-менш пасьпяхова.

Дэманстрацыя з тэлеканаламі — гэта эмацыйная рэакцыя на тое, што перамовы праваліліся.

Па-другое, тут існуе вельмі важкая прагматычная неабходнасьць. Паводле дадзеных Белстату, беларускі экспарт упаў на 51%. Экспартная залежнасьць Беларусі — каля 70%. Пры бюджэце недзе 14 мільярдаў даляраў Беларусі па гэтым годзе трэба скампэнсаваць суму каля 5 мільярдаў даляраў. Амаль 30% бюджэту. 2 мільярды ў выглядзе крэдытаў знайшлі. Але 3 мільярды трэба так ці інакш адшукаць. І, канечне, пытаньне аб 100-мільярдным крэдыце — гэта пытаньне вельмі важкае, бо размова ідзе аб тым, каб захаваць тую беларускую сыстэму, як яна ёсьць.

Здаецца, нідзе, апроч Расеі, гэтыя грошы беларускі прэзыдэнт адшукаць ня можа. Захад не зьбіраецца датаваць Беларусь. Беларусь зьвярнулася з запытам ужо на 2 мільярды даляраў. Гэтае пытаньне трэба будзе вырашаць. Дэманстрацыя з тэлеканаламі — гэта эмацыйная рэакцыя на тое, што перамовы праваліліся. І мэта — пасланне мэсыдж Расеі, што калі вы ня будзеце плаціць, мы зусім выйдзем на Захад. Гульня зразумелая, але посьпехаў я пакуль ня бачу».

**Радыё Свабоды.**

# Каб вырабіць прышчэпку трэба 53 узгадненьні

**Што будзе з эканомікай Беларусі? Гэта паспрабавалі спрагназаваць эксперты падчас круглага стала «Лібэралізацыя эканомікі як выйсьце з крызісу: ці падыходзяць лекі для хваробы?», які адбыўся ў Менску. Прагноз ня вельмі аптымістычны.**

Спачатку эканамісты паспрабавалі **паставіць дыягназ беларускай эканоміцы.** Кіраўнік аналітычнага цэнтру Мізэса Яраслаў Раманчук перакананы: **мы не вырабляем тое, што просіць ўнутраны рынак.**

«Самая галоўная праблема нашай эканомікі – гэта структура, якая не адпавядае новаму стану попыту, як ўнутранага, так і зьнешняга. Мы вырабляем ня тое, што патрабуе зьнешні рынак, мы не вырабляем тое, што просіць ўнутраны рынак. У нас назапашваюцца вельмі сур'ёзныя даўгі. Нават тыя макраэканамічныя дасягненьні, якія былі, ідуць кату пад хвост...»

Возьмем толькі адзін паказчык: сальда зьнешняга гандлю за 2 месяцы склала 815 мільёнаў даляраў – у 40 разоў больш, чым за такі ж пэрыяд летась. Загадчык аддзелу Інстытуту эканомікі Акадэміі навук, прафэсар Аляксандар Лучанок кажа:

«У нас даўно адмоўнае сальда зьнешнегандлёвага балянсу. А ўсясьветны крызіс прывёў да таго, што гэта сальда надзвычай рэзка скокнула. Нашу прадукцыю сталі браць горш. І зараз уся праца ідзе ў адным накірунку: дзе знайсьці грошы, каб гэта адмоўнае сальда неяк збалянсаваць. Мы ўсё больш у больш улазім у пазыкі, якія некаму давядзецца аддаваць».

Эканаміст Міхал Залескі так ахарактарызаваў тое, што зараз адбываецца ў эканоміцы: «Які ў нас крызіс? Крызісы бываюць фінансавыя, крызісы перавытворчасьці і гэтак далей... **У нас крызіс перавытворчасьці, мы робім ня тое, што патрэбна людзям».**

На думку эканаміста Аляксандра Чубрыка, эканоміка працавала па той схеме, калі нехта ведаў, што нам трэба вырабляць, а не самі людзі.

«Гэты крызіс проста паказаў слабыя месцы нашай эканомікі. Іх у нас шмат. Эканоміка працавала па той схеме, калі нехта ведаў, што нам трэба вырабляць, а не самі людзі. Эканоміка Беларусі большую частку свайго ВУП прадае на экспарт. І тут калі зьнешнія рынкі скарачаюцца, ці будзе адбывацца нейкая лібэралізацыя, ці, наадварот, будуць зацiскацца гэтыя гайкі – гэта эканоміку не ўратуе. Зараз нічым беларускую эканоміку з крызісу ня выведзеш».

Што тычыцца лібэралізацыі, то да яе ўсе аднадушна паставіліся скептычна. **Прафэсар Аляксандар Лучанок прыгадаў, што самі беларускія ўлады пра лібэралізацыю загаварылі толькі тады, калі занепакоіліся: як выбіць крэдыты ў МВФ:**

«Вось тады і прынялі нейкія захады да лібэралізацыі. А так думаць, што будуць нейкія рухі, наўрад ці варта. Я думаю, працэс будзе марудны, калі ня будзе праблемаў у разьлікамі».

Эканаміст Міхал Залескі выказаўся наконт лібэралізацыі коратка і трапна:

Ніякай лібэралізацыі няма.

«Ніякай лібэралізацыі няма, ніхто яе не зьбіраецца рабіць, і нікому такая лібэралізацыя не патрэбна. Гэта адны словы. У нас, каб зрабіць прышчэпку, трэба прайсьці 53 узгадненьні. Вось гэта трэба зьнішчыць. Тады будзе лібэралізацыя. Астатняе – пустыя размовы».

Што да прагнозаў на будучыню, кіраўнік аналітычнага цэнтру Мізэса Яраслаў Раманчук настроены ня вельмі аптымістычна: інвэстыцыі, на яго думку, упадуць на 15%, рэальны даходы насельніцтва зьнізяцца таксама на 15%. **Курс даляра вырасьце да 3500 рублёў.** Дэвальвацыя будзе паўзучай. Адзіны прыемны прагноз – істотна зьнізяцца кошты на жытло. Вось толькі дзе ўзяць грошы, як на яго зарабіць – рэцэпту ня даў.

**Радыё Свабода.**

# ПРОПАГАНДА ЗАЖИГАЕТ

**Три девицы (врач, педагог и журналист) под окном сели как-то вечерком и обсудили экономический кризис. Выяснилось, что и снижение зарплаты, и рост цен, и неполная занятость – все это благо.**

Журналист обосновала этот тезис на страницах газеты «Рэспубліка». Вот избранные цитаты.

«Итак, действительно, с начала года зарплаты наши в долларовом эквиваленте стали меньше. Но ведь живем-то мы не за доллары… А за наши родимые рубли. Конечно, хотелось бы летом в отпуск отправиться к теплому морю. Но если по новому курсу рука не поднимается купить «зеленые», можно ведь один сезон и пропустить и съездить всем вместе на Браславские озера! Следующий «кризисный пункт» – цены в магазинах. Говорят, они выросли. Почему рассуждаю на эту тему неопределенно? Сейчас объясню.

Дело в том, что ценники на продукты местного производства вполне стабильны.

Правда, значительную долю рациона составляют фрукты, по большей части не местного произрастания, но ведь и на них цена не слишком отличается от прошлогодней. Действительно, был скачок в начале года, а потом все как-то встало на свои места.

Моя подружка Наташа любит много и вкусно поесть. Отсюда и лишний вес. А теперь вот появился двойной стимул от избытков еды отказаться, перейти на здоровое питание.

Вторая подруга Катя рассказала, что ее муж теперь работает в режиме сокращенной недели. Но супруг Кати без дела не сидит. Уже несколько лет все не было времени привести в порядок свой дачный участок, починить забор, посадить фруктовые деревья. Теперь же появилось свободное время, которое хозяин семьи проводит на даче. Грядки разбил, уже редиску посадил, скоро за картошку возьмется. «Нет худа без добра…» — делает вывод Катерина».

Этот пропагандистский шедевр венчает вывод специально для «совсем тупых»: мол, надо «чуть-чуть подождать», а не протестовать на улицах, как латыши, венгры, греки…

И действительно: почему бы не подождать? Ведь, если верить трем девицам, «жить стало лучше, жить стало веселее».

Конечно, зарплаты упали не только в долларовом эквиваленте, но и в рублях, а цены выросли не только на импорт, но и на продукцию отечественных производителей. Но ведь это мелочи жизни, правда?..

Спасибо экономическому кризису, который изъял у нас губительные для нации излишки доходов!

# МІКОЛКА ЛУКАШЭНКА – ГАЗЭТНЫ АНТЫГЕРОЙ

**Разьезды Аляксандра Лукашэнкі на пару з сынам Мікалаем спарадзілі цэлую сэрыю зьедлівых публікацый у прэсе і сюжэтаў на тэлебачаньні.**



Асабліва актыўнічаюць расейскія СМІ, імпэту якім дадалі нядаўнія візыты абодвух Лукашэнкаў адразу ў Маскву, а потым у Сочы. Таксама ў прыцэле журналістаў іншы візыт Лукашэнкі — у Армэнію. Падобна, упершыню ў палітычнай практыцы адзін прэзыдэнт прыйшоў на перамовы да іншага разам зь дзіцём.

На мінулым тыдні скандальны «Московский комсомолец» выдаў цэлы сэрыял, прысьвечаны асабістаму жыцьцю Аляксандра Лукашэнкі. Загалоўкі адпаведныя: «Лукашэнка робіць піяр на сыну», «Бацька забраў у сына мамку», «Лукашэнка цягаецца за спадніцамі і трымае пры сабе сына».

«Лукашэнка не перастае зьдзіўляць сусьветную грамадзкасьць парушэньнем усіх пісаных і няпісаных правілаў дыпляматычнага этыкету, — піша аўтар газэтнага матэрыялу. — Калі прэзыдэнт Беларусі наведваў з афіцыйным візытам Ерэван, па трапе прэзыдэнцкага самалёта Бацька спускаўся разам са сваім пазашлюбным сынам і „спадкаемцам», 5-гадовым Колем».

У іншым артыкуле — гісторыя кар'ернага ўзьлёту і бalючага падзеньня Ірыны Абельскай, Міколкавай маці, у якой, па інфармацыі журналістаў, Лукашэнка канчаткова забраў сына. Расказваецца пра новую фаварытку прэзыдэнта — сьпявачку Ірыну Дарафееву, якая зьмяніла «на троне» Абельскую.

29 сакавіка ў выніковай перадачы «Неделя» на расейскім тэлеканале «Ren TV» быў паказаны сюжэт пра Лукашэнку і ягонага сына. Падтэкст той жа — адкуль узяўся хлопчык і на якой падставе Лукашэнка ўзваліў на сябе ролю адзінокага бацькі?

Тэму Міколкі ўзьнялі папулярныя шоўмэны гумарыстычнага праекту «Прожекторперисхилтон». Іван Ургант, Сяргей Сьветлакоў і Аляксандар Цэкала непрыкрыта кпілі з Лукашэнкаў, што выклікала цэнзуру — кавалак пра Аляксандра Рыгоравіча і Мікалая Аляксандравіча на ОНТ быў выразаны. Без купюраў імправізацыю на тэму бацькі і сына ўбачылі гледачы Першага расейскага каналу:

Ургант: «Аляксандар Лукашэнка наведаў Армэнію разам са сваім, калі не памыляюся, 5-гадовым сынам».

Сьветлакоў: «Карацей, крызіс — эканоміць на няньцы».

Цэкала: «Вусаты нянь…»

Сьветлакоў: «Пяцігадовы Коля стаў удзельнікам прэзыдэнцкіх перамоваў…»

Ургант: «Дзіўнае прозьвішча ў Колі — Пяцігадовы…»

Сьветлакоў: «Кожны год прозьвішча зьмяняецца… Дык вось: прэзыдэнт Беларусі наведваў з афіцыйным візытам Ерэван. Па трапе прэзыдэнцкага самалёту бацька (вось як цудоўна — нарэшце ёсьць Сын і ёсьць Бацька) спускаўся разам са сваім пазашлюбным сынам…»

Ургант: «Во зьдзівіліся афіцыйныя дзеці, якія сустракалі яго ў Ерэване: тата, а хто гэта?»

Сьветлакоў: «А той адказвае: не хачу расказваць пра тую пасяўную… Проста пазнаёмцеся: Коля, ён будзе жыць з намі».

Ургант: «Што яшчэ дзіўна: падчас вучэньняў, якія праходзілі ў Беларусі, генэралы дакладалі не Аляксандру Лукашэнку, а маленькаму Колю. Цяпер я разумею, што 5-гадовы сын Лукашэнкі ўжо валодае пэўным уплывам. І гэта тлумачыць, чаму міністрам фінансаў Беларусі стаў Кар-Карыч».

Кар-Карыч — адзін з пэрсанажаў расейскага мультфільму «Сьмяшарыкі». А вось Міколка сапраўды робіцца мішэньню для кпінаў. За ігнараваньне дыпляматычнага пратаколу упершыню ў прыцэл тэлекамэраў малодшы сын прэзыдэнта трапіў летась, калі зьявіўся на саміце кіраўнікоў краін СНД у Бішкеку. Была паездка на Алімпіяду ў Пэкін; рукой Міколкі Лукашэнка галасаваў на парлямэнцкіх выбарах, езьдзіў па чарнобыльскіх рэгіёнах, разам Лукашэнкі выбіралі прыгажуняў.

Самым ураджайным выдаўся сакавік — аздараўленчыя паездкі на курорты Сэрбіі, Армэніі, Краснадарскага краю. Аднак апатэозам усё ж застаюцца мінулагодніх вайсковыя вучэньні, калі апрануты ў строй колеру «хакі» Міколка прымаў рапарты ад генэралаў.

«Московский комсомолец» сьцьвярджае, што згуляць на сыну Лукашэнку параіў брытанскі піяршчык Тымаці Бэл, які за немалыя грошы ўзяўся стварыць станоўчы імідж Беларусі ў сьвеце. Нібыта Бэл даведў Лукашэнку, што сямейны чалавек выклікае ў грамадзянаў больш даверу. І калі няма жонкі, то вакантнае месца можа заняць сын. Аднак, піша выданьне, Лукашэнка, відавочна, прыняў словы занадта блізка да сэрца і пачаў цягаць Міколку ўсюды, даводзячы сытуацыю да абсурду.

А вось тэатральны рэжысэр Валер Мазынскі лічыць, што ўзьлёт Міколкі — чыстая самадзейнасьць самога Лукашэнкі. Піяршчыка Бэла ў ролі рэжысэра-пастаноўшчыка спадар Мазынскі ўявіць ня можа:

— Калі вы прэзэнтуеце спадару Бэлу такую знаходку, то я лічу, што ад яго гэта зыдзек, а не прапанова. Бо ён жа сам, прабачце, эўрапеец. І такое ўсур'ёз параіць ня можа, ён можа такім чынам толькі падставіць. Я ня ведаю нават, у якой цывілізацыі гэта ўхваляецца. З сабой сына можна ўзяць у госьці, у іншую вёску, да дзядзькі, да цёткі. І то, каб нейкім чынам дзяцей дапускалі да сур'ёзных размоваў, да дарослых — то я такога не прыгадаю ў нашай вёсцы, каб бацька пры сабе трымаў дзіця.

-- То бок хутчэй за ўсё гэта ягонае разуменьне этычных нормаў і ягоная самадзейнасьць?

-- Я думаю, што так. Бо гэта нешта не падобна да чыёйсьці рэжысуры. Бачыце, нават для расейцаў гэта дзіва, для людзей больш усходняга пляну, і то гэта выклікае такую іронію. Калі не сказаць больш. Увогуле гэта невытлумачальна, гэта нейкае ноў-хаў. Адзінае, што, можа, прызвычаімся. Бо чалавек мае здольнасьць да ўсяго прызвычайвацца.

Кіраўнік Беларусі — пэрсанаж, да чыйго вобразу часта зьвяртаецца расейскі сатырык Віктар Шэндэровіч. Ён кажа, што кагосьці саромецца ці перад кімсьці камплексаваць Лукашэнка не зьбіраецца. Ягонай уладзе ў Беларусі мала што пагражае, таму правілы ён не выконвае, а дыктуе:

«Зразумела, што Лукашэнка жывым ад улады ня сыдзе, яму ўжо дзявацца няма куды. Усё ж расейская ўлада, Пуцін (Мядзьведзеў — гэта толькі прыкрыцьцё) паспрабаваў хоць бы сваю прагу да кіраваньня задэкарыраваць. Пуцін усё ж больш сыстэмны чалавек, там усё ўпірацца ў сыстэму. І Пуцін у Расеі — функцыя, а ня сутнасьць. А ў выпадку з Лукашэнкам гэта асабістая ўлада, пэрсанальная ўлада. І так гэта ўсё застанецца».

# ВЗОРВАН ПАМЯТНИК ЛЕНИНУ



**На площади перед Финляндским вокзалом в Санкт-Петербурге в результате взрыва самодельного устройства поврежден памятник Владимиру Ленину.**

«Около 04:30 произошел хлопок, предположительно, от сработавшего небольшого взрывного устройства, после которого на фигуре Ленина образовалась дыра диаметром не больше метра», - сказал собеседник.

Источник «Интерфакса» в правоохранительных органах уточнил, что фигура Ленина «повреждена со стороны спины взрывом безоболочного взрывного устройства мощностью около 300 граммов в тротиловом эквиваленте».

Представитель МЧС добавил, что вокруг постамента разбиты 8 из 10 фонарей.

По данным сайта Фонтанка.Ру, на памятнике образовалась воронка размером 80 на 100 міліметров.

Вокруг постамента разбиты восемь из десяти фонарей. Пострадавших в результате инцидента нет.

На месте происшествия работают взрывотехники, которые пытаются установить тип взрывного устройства. Также пытаются определить организатора взрыва.

# ХОПІЦЬ «ПОЎЗАЦЬ НА КАЛЕНЯХ»

## па кабінетах расейскіх чыноўнікаў

Беларускі кіраўнік абвінаваціў расейскія ўлады ў «несумленнасці».

Падчас працоўнай камандзіроўкі ў Гомельскую вобласць 7 красавіка Аляксандр Лукашэнка заявіў, што незадаволены сітуацыяй, звязанай з выкананнем дамоўленасцяў з расейскага боку па зняцці абмежаванняў ва ўзаемным гандлі, адзначае «Інтэрфакс».

«Трэба спыніцца «поўзаць на каленях» па іх кабінетах», - заявіў А.Лукашэнка, звяртаючыся да чальцоў беларускага ўрада.

«Не хочуць пускаць нас на свае рынкі - нам трэба шукаць іншыя вектары экспарту. Жыццё прымушае лезці нас на іншыя рынкі», - сказаў А.Лукашэнка.

Кажучы пра Расею, Лукашэнка заявіў, што «там больш несумленнага стаўлення да нас».

«Так, мы не выбіраем газ, а нам прад'яўляюць штрафныя санкцыі. Дамовіліся па 150 даляраў за газ, іншыя прыязджаюць і кажуць, што трэба больш», - заявіў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Паводле яго словаў, узамен зняцця абмежаванняў па доступе беларускіх вытворцаў на рынак Расеі, расейскі бок прапаноўвае Беларусі падзяліцца сваёй уласнасцю.

«Аддайце нам тое, аддайце нам гэта», - сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым ён падкрэсліў, што «ніхто ў цяперашніх умовах нічога прадаваць не будзе».

Лукашэнка заявіў, што беларускія вытворцы «павінны бачыць не толькі Расею».

«Трэба шукаць іншыя рынкі. Хто думаў, што мы будзем прадаваць сметанковае масла і каўбасу ва Украіну», - адзначыў беларускі кіраўнік.

«Трэба пацыху дыверсіфікаваць экспарт і выходзіць на іншыя рынкі», - дадаў ён.

# Невясёлае лідэрства

По выніках першага квартала 2009 года Беларусь стала лідэрам сярод краін былога СССР па тэмпах росту афіцыйнага курсу даляра ЗША да нацыянальнай валюты.

Пра гэта сведчыць праведзены БелаПАН аналіз курсаў на 31 снежня 2008 года і 31 сакавіка 2009 года.

Афіцыйны курс даляра ў Беларусі вырас за гэты перыяд на 28,95%

(з 2.200 да 2.837 рублёў). У першую пяцёрку ўвайшлі таксама Казахстан, дзе кацiроўка амерыканскай валюты павялічылася за тры месяцы на 25,36% (са 120,77 да 151,4 тэнге), Арменія — на 19,9% (з 306,73 да 367,77 драма), Расія — на 15,77% (з 29,3804 да 34,0134 рубля) і Таджыкістан — на 10,51% (з 3,4519 да 3,8146 самоні).

Далей ідуць Кыргызстан — 8,15% (з 39,4181 да 42,6295 сома), Латвія — 7,47% (з 0,495 да 0,532 лата), Літва — 6,48% (з 2,4507 да 2,6096 літа), Эстонія — 6,17% (з 11,1052 да 11,7905 кроны), Малдова — 5,38% (з 10,4002 да 10,9602 лея), Узбекістан — 2,8% (з 1.393 да 1.432 сумаў), Азербайджан — 0,22% (з 0,801 да 0,8028 маната) і Грузія — на 0,18% (з 1,667 да 1,67 лары).

Не змяніліся курсы ў Туркменістане (2,85 маната) і Украіне (7,7 грыўны).

У самаабвешчанай Прыднястроўскай Малдаўскай Рэспубліцы (ПМР), дзе ёсць свая валюта, курс даляра вырас на 6,24% (з 8,4715 да 9 рублёў).

Курс даляра да беларускага рубля ў сакавіку знізіўся на 0,73%.

Гэта шосты паказчык пасля Расіі (4,78%), Эстоніі (4,56%), Літвы (3,88%), Латвіі (3,8%) і Грузіі (0,83%). На меншую, чым у Беларусі, велічыню знізіўся курс даляра ў Азербайджане (0,30%). Не змяніліся курсы ў Туркменістане і Украіне. Афіцыйная кацiроўка амерыканскай валюты вырасла ў Арменіі (на 20,25%), Кыргызстане (3,57%), Малдове (2,79%), Таджыкістане (2,04%), Узбекістане (1,67%) і Казахстане (0,64%).

**Дзмітры Уласаў, БелаПАН.**

**Заснавальнік і рэдактар:** Леанід Гаравы

**Адрас рэдакцыі:** 211573, г. Гарадок, вул. Гагарына, д.30Б, кв.16. E-mail: haravy@tut.by
Тэл. 8-02139-4-42-52, маб. + 375296723842 (V), +375298147766 (МТС)

**Наклад: 290 асобнікаў.**
Выдаецца пры падтрымцы сяброў.
Распаўсюджваецца бясплатна